У цэнтры ўвагі

# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

**У Мінскай вобласці па выніках дзевяці месяцаў выкананы ўсе пяць ключавых параметраў эфектыўнасці. У прыватнасці павялічыўся экспарт тавараў і паслуг, найбольш — у Кітай. Валавы рэгіянальны прадукт за гэты перыяд склаў 15,1 мільярда рублёў, тэмп росту да аналагічнага мінулагодняга ўзроўню — 104,8 % пры прагнозе 103,6 %.**
**Пра гэта паведаміў старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА падчас пасяджэння аблвыканкама па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця цэнтральнага рэгіёна. Анатоль Ісачанка асабліва падкрэсліў, што да канца года нельга дапусціць зніжэння тэмпаў росту валавога рэгіянальнага прадукту.**

### Канкурэнтаздольны — значыць, перспектыўны

Як адзначыла **старшыня камітэта эканомікі Мінаблвыканкама Тацяна БРАНЦЭВІЧ**, нягледзячы на тое што ўсе параметры сацыяльна-эканамічнага развіцця, вызначаныя Саветам Міністраў, выкананы, ёсць яшчэ кірункі, над якімі трэба шмат працаваць. «Мы разумеем, што няма будучыні без інвестыцый. Мы лічым, што павінна быць усебаковае супрацоўніцтва з замежнымі краінамі. Гэта дазволіць прыцягнуць дадатковыя інвестыцыйныя рэсурсы для развіцця эканомікі рэгіёна. Вельмі значнымі для нас з'яўляюцца экспартныя пастаўкі ў цэлым. Фактычна тэмп іх росту — 115 %. Аднак мясцовым органам кіравання неабходна працаваць, у тым ліку з прадпрыемствамі, дыпламатычнымі службамі, кіраўнікамі розных замежных рэгіёнаў, з тым каб не страціць пазіцыі і пашырыць экспарт у іншыя краіны».

Па словах Тацяны Віктараўны, заклапочанасць выклікаюць перш за ўсё прадпрыемствы Міністэрства прамысловасці. Трынаццаць з іх знізілі аб'ёмы выпуску прадукцыі ў грашовым выражэнні на 200 мільёнаў рублёў. Мінаблвыканкам па гэтым пытанні цесна супрацоўнічае з Мінпрамам: выпрацоўваецца комплекс мер да канца гэтага года, на 2020-ы і наступныя гады. «Мы фінансуем шэраг праектаў з інавацыйнага фонду Мінскай вобласці, каб атрымаць новыя ідэі, паколькі 73 % ад усёй прадукцыі, што выпускаецца ў рэгіёне, пастаўляецца на экспарт. Мы разумеем, калі не будзем канкурэнтаздольнымі ў гэтым асяроддзі, то будучыні не будзе».

### Рэкорды раслінаводства

Вынікі развіцця цэнтральнага рэгіёна разглядаліся ў цесным звязку з аграрным комплексам.

— Сёлета сельская гаспадарка спрацавала досыць няпрэнна. Па ўсіх відах прадукцыі раслінаводства атрымалі рост да адпаведнага леташняга ўзроўню. Па многіх паказчыках ён рэкордны. Намалочана больш за 400 тысяч тон зерня кукурузы, нарыхтавана больш як 4 мільёны тон сіласу, звыш 2 мільёнаў тон кармавых адзінак, больш як 29 тысяч тон ільнотрасты. І ўсё гэта ўпершыню ў гісторыі Міншчыны. Парадавала і ўраджайнасць бульбы — валавы збор на 30 % больш за мінулагодні. Намалочана збожжавых звыш 2 мільёнаў тон разам з кукурузай, — расказаў **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ.** — Так што створана надзейная кармавая база для грамадскага статка.

Разам з тым больш складаная абстаноўка ў жывёлагадоўлі. За 9 месяцаў на 1,5 % скарацілся валавы аб'ём ялавічыны ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, на 2 % зменшыліся аб'ёмы вырошчвання птушкі. Затое аб'ём вытворчасці свініны павялічыўся на 8 %. Наогул, развіццю жывёлагадоўлі аддаецца значная ўвага. Да канца года плануецца ўвесці ў дзеянне 84 памяшканні для ўтрымання буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 21 малочнатаварную ферму. Сёлета малочная галіна развіваецца стабільна: павялічаны аб'ёмы экспарту прадукцыі, аб'ёмы выручкі. Актыўна асвойваюцца замежныя рынкі, куды пастаўлена малочных прадуктаў у тры разы больш, чым летась. Больш як у 10 разоў павялічыліся пастаўкі «малочкі» ў Кітай. Аднак, што датычыцца мяса і мясных прадуктаў, то выручка ад іх рэалізацыі скарацілася. На гэта паўплывалі аб'ектыўныя прычыны. У прыватнасці, Расійская Федэрацыя ўвяла абмежаванні на пастаўкі мяса на косці. Разам з тым прадпрыемствы Міншчыны павялічылі экспарт у Казахстан і Узбекістан, працуюць над атрыманнем сертыфіката для паставак у Кітай.

### Смалявічы будуць забудоўваць комплексна

— У Мінскай вобласці выконваецца праграма па ўзвядзенні жылля для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні ўмоў пражывання. На гэты год даведзена заданне пабудаваць мільён 115 тысяч квадратных метраў. Але ўжо сёння бачым, што яно будзе перавыканана, выйдзем на мільён 120 тысяч «квадратаў», — запэўніў **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Аляксандр КРУЧАНАЎ.** — Шмат увагі аддаём забеспячэнню жылплошчай шматдзетных сем'яў. Плануецца, што да канца года 1112 з іх атрымаюць жыллё, у наступным годзе — практычна ўдвая больш.

Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу да 2021 года выйсці на забеспячэнне жыллём шматдзетных такім чынам, каб яны стаялі на чарзе не больш за год з дня пастаноўкі на ўлік. Сёння фарміруецца праграма на 2020 год. У яе закладзены неабходныя параметры, каб выканаць даручэнне.

— Актыўна працуем над развіццём Смалявіч — горада-спадарожніка Мінска. МАПІД пачаў будаўніцтва эксперыментальнага 192-кватэрнага жылога дома. Падаць заяву на кватэру тут могуць мінчане, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў незалежна ад даты пастаноўкі на чаргу. Але пры гэтым яны павінны зняцца з уліку на атрыманне жылля ў сталіцы. Дарэчы, першачарговае права даецца шматдзетным сем'ям. Па інфармацыі Мінгарвыканкама, на 192 кватэры ўжо пададзена каля 600 заяў.

У перспектыве ў горадзе-спадарожніку з'явяцца два мікрараёны. Пад іх будаўніцтва выдзелены ўчасткі ў 26 і 29 гектараў. На першым — пабудуюць дамы толькі для мінчан, на другім — для ўсіх ахвотных. Тэрыторыі будуць забудоўвацца комплексна, з сацыяльнымі аб'ектамі, дзіцячымі садкамі, школамі.

**Тацяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Простыя лічбы

# ТОЛЬКІ АБ'ЯДНАЎШЫСЯ, МЫ МОЖАМ УПЛЫВАЦЬ НА ЗМЯНЕННЕ КЛІМАТУ

**Сёлета апошні свой белы грыб старшыня Беларускага геаграфічнага таварыства Аляксей ЯРОТАЎ знайшоў у дуброве пад Валожынам у другой дэкадзе лістапада. За 55 гадоў сваёй практыкі грыбніка ён да гэтага выпадку ніколі так позна не знаходзіў баравікі ў нашых лясах. Усё спісваць на глабальнае пацяпленне, ці ў нас проста запозненыя з'явы бабінага лета? А вы як лічыце?**
**Гаворка ідзе хутчэй за ўсё пра раптоўныя надыход нейкіх анамальных павышаных тэмператур, анамальных ападкаў, якія прыводзяць да падтапленняў тады, калі іх не чакалі. Каб змякчыць удары экстрэмальных сінаптычных з'яў, трэба не толькі бачыць праблему, але і ведаць шляхі яе вырашэння.**
**Менавіта для гэтага быў арганізаваны круглы стол «Адаптацыя да змен клімату ў Беларусі: практыкі ўключэння грамадскасці» (на матэрыялах міжнароднага праекта TeRRIFICA).**
**Ён праходзіў у рамках міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасныя кірункі развіцця фізічнай геаграфіі: навуковыя і адукацыйныя аспекты ў Мэтах устойлівага развіцця».**



### Сакрэт літра гарачай вады

На мерапрыемстве было сказана шмат разумных і карысных слоў аб міжнароднай кліматычнай палітыцы, задачах і месцы нашай краіны ў гэтым міжнародным працэсе. Але нас сапраўды зацікавіла адно няпростае пытанне: няўжо звычайныя людзі сапраўды могуць уплываць на змяненне клімату? **Кандыдат геаграфічных навук Аляксей ЯРОТАЎ** паспрабаваў растлумачыць нам гэта на пальцах.

Мы ўсе жывём звычайным жыццём, але ў нашых паводзінах ёсць экалагічныя нормы і правілы, прыдуманыя нашымі продкамі даўным-даўно. Яны распрацаваны ў тыя часы, калі ўпершыню быў уведзены тэрмін «экалогія».

Усім вядома, што каб атрымаць літр гарачай вады, трэба спаліць адзінку ўмоўнага паліва. Калі мы кожную раніцу эканомна выкарыстоўваем гэтую ваду, калі чысцім зубы ці мыемся, то мы аўтаматычна захоўваем газ, мазуту або вугаль. Калі мы з вамі выкарыстоўваем нашы рэсурсы і потым іх здаём на пункты збору другаснай сыравіны, то гэтым самым таксама эканомім энергію.

Мы жывём у буйным горадзе ці ў сельскай мясцовасці. Магчыма, у нас ёсць асабісты аўтамабіль і мы не ходзім пешшу нават у булачную за два кварталы. Атрымліваецца, што мы сабе і сваім суседзям забруджваем паветра шкоднымі выкідамі. Аляксей Яротаў лічыць, што пры адаптацыі грамадства да экстрэмальных змен клімату трэба ў першую чаргу змяняць свае асабістае стаўленне ў бок мінімальнага, рацыянальнага спажывання.

Калі мы выкарыстоўваем аўтамабіль толькі па неабходнасці, то ў пешых шпацырах і паходах на не вельмі вялікія адлегласці не толькі трэніруем свой арганізм і беражом здароўе, але і не забруджваем атмасферу.

### Вогнішча? Не палі без патрэбы

У многіх ёсць дапаможны прысядзібны ўчастак або дача. Пара і там жыць па экалагічна правільных пастулатах — весці рацыянальную сельскую гаспадарку. Мы там ужо не спальваем лісце з дрэў і бульбяное бацвінне, а закладваем іх у кампостную яму, якая таксама выдзяляе вуглякіслы газ, але ў значна меншай колькасці, і да таго ж дае нам угнаенне. Усё гэта называецца кліматаарыентаваным ладам жыцця — калі мы з вамі паводзім сябе так, каб найменшым чынам нашкодзіць прыродзе.

Ці сапраўды ў нас цяпер эпоха глабальнага пацяплення? Дакладнага адказу нам не дасць ніхто. Меркаванні навукоўцаў падзяліліся. Адны кажуць, што тыя змены, якія адбываюцца апошнім часам, развіваюцца па сінусоідзе, а другія — што нас чакае катаклізм высокіх тэмператур. Хутчэй за ўсё, ісціна дзесьці пасярод. Але ў абодвух выпадках нам трэба мяняць лад жыцця. Старацца прыбіраць пасля сябе пластмасу, не браць у крамах пластыкавыя пакеты, а насіць сумку або авоську. Не трэба выкідваць на сметнік лішнія рэчы (лепш аддаць у дабрачынную арганізацыю — яны яшчэ могуць спатрэбіцца) і не купляць таго, што не з'ясі або не адзенеш. Калі мы навучымся неяк абмяжоўваць свае патрэбы, то станем здольнымі ўплываць на клімат. І гэта не жарт.

### Нас мільёны, а ўсіх разам — мільярды

Адзін чалавек у нашым горадзе своечасова выключыў гарачую ваду і сэканоміў усяго адзін літр. Але толькі ў беларускай сталіцы жыве два мільёны чалавек. Калі кожны дзень мы ўсе разам зберажом хоць па літры, за дзень будзе цэлае возера вады.

У нашым грамадстве ёсць такое меркаванне, што мы не можам паўплываць на глабальны клімат. Але на самай справе гэта не так, лічыць спікер. Вядома, у чалавека ўзнікае пэўны дысананс, калі ён эканоміць ваду на кухні, а ў той жа час бачыць, як працуе ЦЭЦ, з трубы якой вылятае велізарная колькасць дыму. Але трэба памятаць, што калі мы запальваем сто тысяч вогнішчаў на сваіх дачах, то атрымліваем яшчэ адну ЦЭЦ. Як сфарміраваць у людзей, у мясцовай супольнасці, тых, хто жыве побач, спосаб жыцця, які б не вёў да лішняга забруджвання навакольнага свету, нашай прыроды?

Прыкладаў дастаткова, лічыць Аляксей Яротаў. Возьмем Швецыю. Уявіце сабе, калі ў цэнтры горада Мінска будзе прыярытэт у пешахода, веласіпедыста і толькі потым у аўтамабіля пры дарожным руху! Так жывуць, напрыклад, Стакгольм і Бялград. У гэтых гарадах ёсць цэлыя раёны, куды доступ аўтамабіляў забаронены.

А, напрыклад, у Хельсінкі восенню няма павальнай уборкі лісця. Фіны лічаць, што ў падзенні яго на тратуар няма нічога ганебнага, бо гэта натуральны працэс прыроды. А ў нас галаўны боль для дворнікаў. Другое пытанне, куды лісце потым дзяваюць. Аказваецца, што яго спальваюць або складуюць у пэўных месцах, дзе яно павольна перагнівае. Але ёсць жа праекты, дзе тое ж лісце ператвараюць у паперу.

### Шкло застаецца нейтральным рэчывам

Сёння зноў становіцца модным выкарыстанне шкляной тары. Але, атрымліваецца, шклабой таксама з'яўляецца бескарысным смеццем, бо шкло не гніе? Наш суразмоўца нічога страшнага ў гэтым не бачыць. Шкло — прыродны матэрыял, яно прысутнічае ў нашай зямлі. Калі вулкан прачынаецца, то выяргае са свайго чрава вулканічнае шкло. Яно з'яўляецца натуральным матэрыялам. Гэта не тыя сто тысяч новых злучэнняў і матэрыялаў, якія былі створаны чалавекам штучна, і не раскладаюцца сотні гадоў.

— Усё гэта ў рамках адаптацыі да змен клімату мы павінны казаць насельніцтву. Заклікаць людзей быць як мы — кліматаарыентаванымі. Бо мы ж не хочам бачыць цэлафанавых пакетаў у сваім двары і пластыкавых бутэлек у грыбных месцах любімага лесу, праўда?

**Сяргей КУРКАЧ.**